• чэрвень • 2010 •

# MAkAsIN

## ПОЛЬШЧА НЯ ВЫБРАЛА ПРЭЗЫДЭНТА

***У Польшчы дагэтуль няма прэзыдэнта. Выбары ня выявілі пераможцу: кансэрватар Яраслаў Качыньскі і лібэрал Браніслаў Камароўскі выйшлі ў другі тур, дзе і вырашыцца зыход выбараў.***



**Б**рат загінулага прэзыдэнта Леха Качыньскага Яраслаў прайграў сябру Салідарнасьці менш за 4.5 %. Аналітыкі адзначаюць, што і першы і другі кандыдат маюць шанцы на перамогу, шмат што будзе залежыць ад таго, каму аддадуць галасы прыхільнікі левака Гжэгажа Напяральскага, які заняў трэцяе месца з 14 % галасоў.

У Польшчы дагэтуль няма прэзыдэнта. Учорашнія выбары ня выявілі пераможцу: кансэрватар Яраслаў Качыньскі і лібэрал Браніслаў Камароўскі выйшлі ў другі тур, дзе і вырашыцца зыход выбараў. Брат загінулага прэзыдэнта Леха Качыньскага Яраслаў прайграў в.а. прэзыдэнта і сябру Салідарнасьці менш за 4.5 %. Аналітыкі адзначаюць, што і першы і другі кандыдат маюць шанцы на перамогу, шмат што будзе залежыць ад таго, каму аддадуць галасы прыхільнікі левака Гжэгажа Напяральскага, які заняў трэцяе месца з 14 % галасоў.

Беларуская меншасьць у Беластоку традыцыйна падтрымлівае левыя сілы, але гэтым разам шмат хто зь беларусаў галасаваў за памяркоўнага Камароўскага. Агулам на ўсходзе Польшчы, у тым ліку і ў Беластоцкім ваяводзтве перамог Яраслаў Качыньскі.

Кансэрватыўныя палякі ўстаюць рана раніцай і ідуць на месу. Таму выбарчыя ўчасткі адчыніліся экстрэмальна рана – у 6 гадзін раніцы. Перад палякамі стаяў ня толькі палітычны, але і маральны выбар: памяць аб катастрофе ў Смаленску, у якой загінула вялікая частка эліты краіны, яшчэ вельмі моцная.

***generation.by***

## БЕЛАРУСЫ ВЕДАЮЦЬ ПРА ЭЎРАЗЬВЯЗ МЕНШ ЗА ЎСІХ СВАІХ СУСЕДЗЯЎ

***Беларусы найменш інфармаваныя аб Эўрапейскім зьвязе: толькі кожны пяты апытаны беларус прыгадвае назвы краін-чальцоў ЭЗ, а кожны другі ня здольны назваць нават месца, дзе разьмяшчаюцца кіруючыя органы Зьвязу. Такія вынікі былі атрыманыя у міжнародным дасьледаваньні навукоўцаў унівэрсытэту Абэрыстуіт.***

**Б**еларускае грамадзтва дагэтуль мала цікавяцца Эўрапейскім зьвязам. Аб гэтым кажуць вынікі дасьледаваньня University of Aberystwyth з унівэрсытэту Абэрыстуіт (University of Aberystwyth), што ў Вялікабрытаніі.

У часу дасьледаваньня навукоўцы параўналі дадзеныя грамадзкіх апытаньняў у Беларусі, Украіне, Расеі і Малдове. Высьветлілася, што расейцы найбольш інфармаваныя аб ЭЗ, а Малдаване актыўней за ўсіх вітаюць зьбліжэньне са Зьвязам. А вось украінцы, насуперак палітыцы іх нядаўняга ўраду, упадабалі балянсаваць паміж Расеяй і ЭЗ.

Беларусы асацыююць ЭЗ зь лібэральнымі-дэмакратычнымі каштоўнасьцямі, але ўласнай краіне прыпісваюць супрацьлеглыя каштоўнасьці, падкрэсьліваючы сваю талерантнасьць, павагу да рэлігіі і культурнай спадчыны, кажуць навукоўцы. У нашай краіне вельмі мала чулі аб эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва. Толькі 17 % беларусаў і 20 % украінцаў ведаюць, што гэта такое.

Як адзначаюць аналітыкі BISS, цяпер у Беларусі назіраецца рост ізаляцыяніцкіх настрояў. Толькі 36.2 % беларусаў выступаюць за далучэньні да Эўрапейскага Зьвязу (сярод моладзі гэты паказчык складае каля 58 %). І толькі 19.4 % беларусаў адчуваюць сябе больш блізкім да эўрапейцаў (74.5 % бліжэй да расейцаў).

***Андрэй Сьмятаньнікаў***
***generation.by***

## ПРЫВІТАННЕ, СОНЕЙКА!!!

***Дачакаліся! Рэшта іспытаў і хвастоў здадзена. Пачынаюцца практыкі, а потым яно – час весялухі, цяплыні і прыгажосці.***

стар.4

## МАРАДОНА И ВСЕ-ВСЕ-ВСЕ

***Мысль о том, что современный футбол измельчал на харизматичские личности, блистающие на поле и вне его, подтверждается. Криштиану Роналдо слишком гламурен, Кака слишком богобоязненен…***

стар.5

## ПОЛАЦКІ «РУБОН» – ПОКЛІЧ З МІНУЎШЧЫНЫ

***Доўгачаканы трэці фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон», што адбыўся ў Полацку на мінулых выходных 12–13 чэрвеня, заняў свае пачэснае месца ў ...***

стар.6

# INFO

• З 9:00 21 чэрвеня Расея ўвяла рэжым абмежавання паставак газу ў Беларусь на 15 % з наступным павелічэннем гэтага аб'ёму да 85 %.

• Гнеўныя выпады ў адрас Расеі прагучалі з боку беларускага прызідэнта падчас яго візіту ў Магілёўскую вобласць.

• Прадстаўнічая канферэнцыя няўрадавых арганізацыяў краінаў Усходняй Еўропы і Беларусі прайшла ў Вільні.

• Рассельгаснагляд з 25 чэрвеня 2010 года ўводзіць часовыя абмежаванні на пастаўку малочнай прадукцыі з чатырох беларускіх прадпрыемстваў, кажацца ў паведамленні ведамства.

• Галоўная ваенная пракуратура Расеі не бачыць падставаў для аднаўлення расследавання Катынскай справы.

• Большасць беларусаў нічога не ведаюць пра новую праграму Еўразвяза па супрацоўніцтве з краінамі постсавецкай прасторы.

• Камітэт дзяржаўнага кантролю апублікаваў комплексны план праверак на другое паўгоддзе 2010 года.

• Дэкларуецца, што хуткасць доступу ў сетку Інтэрнэт у Беларусі «у бліжэйшай будучыні павялічыцца ў 10 разоў».

• Беларусь пагражае пачаць адбор газа з транзітнага трубаправода, на свае патрэбы, сцвярджае «Газпром».

• Адноўленая крымінальная справа ў дачыненні да старшыні Івянецкага аддзялення Саюза палякаў Беларусі Тарэсы Собаль.

• Беларускі кіраўнік падкрэсліў неабходнасць развіцця супрацоўніцтва з Расеяй у сферы бяспекі, нягледзячы на эканамічныя праблемы, якія ўзнікаюць паміж дзяржавамі.

• Міністэрства энергетыкі Беларусі заяўляе, што «выпрацоўвае меры» па працы сістэмаў газа-і энергазабеспячэння ва ўмовах абмежавання ААТ «Газпрам» подачы газу.

*www.charter97.org*

# СТАЖЫРОЎКА Ў ЗША ДЛЯ ГРАМАДЗКІХ ЛІДЭРАЎ

***Міжнародная праграма Цэнтра філянтропіі й грамадзянскай супольнасьці (ЗША) прадастаўляе прафэсійныя магчымасьці для старшых мэнэджэраў трэцяга сэктару, якія працуюць у сфэры разьвіцьця дабрачыннасьці й патэнцыялу трэцяга сэктару ў іх родных краінах.***

**П**раграма прапануе:

– удзел у месячным сэмінары, уключаючы лекцыі й інтэнсіўныя заняткі з вопытнымі практыкамі,

– наведваньне фондаў і дабрачынных арганізацыяў для азнаямленьня са спэцыфікай іх штодзённай дзейнасьці,

– сустрэчы з выбітнымі дзеячамі ў некамэрцыйнай сфэры,

– уступ у сетку больш за 145 выпускнікоў з 45 краінаў,

– пашырэньне нацыянальных і міжнародных сетак,

– напісаньне дасьледніцкай працы па прапанаванай тэме, якая закранае будучыя стратэгіі стыпэндыята.

Да ўдзелу запрашаюцца прафэсіяналы, якія працуюць у трэцім сэктары, старэйшыя за 25 год. Прэтэндэнты мусяць гаварыць і пісаць па ангельску.

Стажыроўка адбудзецца з 18 кастрычніка па 12 лістапада 2010 году ў Нью-Ёрку, ЗША.

Апошні тэрмін падачы заявак: 7 ліпеня 2010 году.

Кантакты: Amal A. Muhammad, Tel.: 212-817-2014/2010, The Graduate School and University Center The City University of New York, 365 Fifth Avenue, New York, NY 10016–4309, FAX 212.817.1572.

Больш падрабязную інфармацыю чытайце на сайце:
www.philanthropy.org

***Паводле рассылкі belngo.info***
***Паводле рассылкі БАСР***

# V ЭКАНАМІЧНЫ ФОРУМ МАЛАДЫХ ЛІДЭРАЎ

***З 7 па 11 верасьня 2010 году ў Новым Сончы недалёка ад Кракава, Польшча, адбудзецца V Эканамічны форум маладых лідэраў. Арганізатарамі форуму зьяўляюцца Эўрапейскі дом сустрэчаў – Фонд у Новым Ставе, Эканамічны форум у Крыніцы й Фонд разьвіцьця сыстэмы адукацыі – Польская нацыянальная Агенцыя праграмы «Моладзь у дзеяньні».***

**Ф**орум будзе месцам сустрэчаў і дыскусіяў з палітыкамі, прадпрымальнікамі, прадстаўнікамі Эўракамісіі, кіраўнікамі дзяржаваў і ўрадаў. Удзельнікі форуму будуць ня толькі абмяркоўваць набалелыя праблемы сёняшней Эўропы, але й самі паспрабуюць знайсьці на іх адказы. Форум вызначыць ролю маладога пакаленьня ў грамадзкіх і эканамічных пераўтварэньнях, якія адбываюцца на эўразійскім кантынэнце. Гасьцямі Эканамічнага форуму ў 2010 годзе будуць выбітныя палітыкі, эканамісты й лідэры.

Да ўдзелу ў форуме запрашаюцца маладыя лідэры няўрадавых арганізацыяў, палітычных, грамадзкіх і студэнцкіх арганізацыяў зь Беларусі ды іншых краінаў Эўропы.

Каб прыняць удзел, неабходна запоўніць анлайн заяўку на сайце: http://www.forum-leaders.eu/2010/pl-zgloszenie.php

Апошні тэрмін падачы заявак: 16 ліпеня.

Больш падрабязную інфармацыю чытайце на сайце:
www.forum-leaders.eu

***Паводле рассылкі belngo.info***

# ВАЛЯНТАРЫЯТ У БЕЛАРУСІ – АДНАЎЛЕНЬНЕ ЗАМКУ Ў ЛЮБЧЫ

***Моладзевы адукацыйны цэнтар «Фіальта» запрашае прыняць удзел у кароткатэрміновым праекце EVS у Беларусі. Мэтай праекту зьяўляецца рэстаўрацыя замку ў Любчы каля Навагрудку.***

**В**алянтэры зь Беларусі й Польшчы цягам месяцу будуць жыць каля замку, які будуць рэстаўраваць. Дата правядзеньня праекту: з 15 ліпеня па 15 жніўня 2010 году.

Заяўкі на ўдзел разам з рэзюмэ й суправаджальным лістом, а таксама свае пытаньні дасылайце на эл. адрас:
**semperavanti.evs@gmail.com.**

***Паводле рассылкі belngo.info***

## Британия отказывается от евро

***Великобритания официально отказалась от присоединения к зоне евро в ближайшие пять лет, и упразднила отдел Минфина, занимавшийся этими вопросами. Об этом объявил канцлер Казначейства (министр финансов) страны Джордж Осборн, представляя в парламенте новый бюджет страны.***

«Великобритания не будет вступать в еврозону в течение срока работы нынешнего парламента (до мая 2015 года)», – указал Осборн. «Мы также упраздняем отдел Казначейства, занимавшийся подготовкой к вступлению в еврозону – был и такой. Его сотрудникам будет поручено заняться более продуктивной деятельностью», – с иронией добавил канцлер Казначейства.

Ему пришлось представить депутатам самый тяжелый за последние десятилетия проект бюджета, предусматривающий значительное повышение налогов и сокращение государственных расходов. При этом почти 900 тысяч британцев, получающих низкую зарплату, будут освобождены от уплаты налогов, а более состоятельные, напротив, станут платить больше. Сам Осборн назвал будущий бюджет «суровым, но справедливым».

## Священники звонят в колокола с помощью мобильного телефона

***Современная беспроводная технология, разработанная коллективом итальянских мастеров, пришла на смену церковным звонарям. Чтобы привести колокола в движение, достаточно простого нажатия на кнопку смартфона. Механическое устройство, на котором закреплен колокол, соединен с двигателем. Им управляют с помощью электронной панели, которая может располагаться внутри церкви или на экране мобильного телефона. Таким образом можно приводить в действие колокола, башенные часы и другие объекты.***



Идея о реформировании звонниц возникла у руководителя компании по реставрации старинных колоколов. Карло Рубаготти начал с проведения экспериментов в его родном городе Киари. Сегодня в репертуаре местной церкви насчитывается 140 мелодий. Колокола звонят каждые 15 минут.

Использование беспроводной технологии может решить проблему нехватки звонарей в небольших городах и отдаленных итальянских деревнях. Многие священники одобрили применение беспроводной системы.

## Тысячам пользователей «ВКонтакте» грозит судебное преследование




***Президент группы компаний «АМЕДИА» Александр Акопов намерен устроить если не войну, то, по крайней мере, показательное судебное разбирательство с администрацией и пользователями популярной социальной сети «ВКонтакте», в которой можно без всяких проблем бесплатно смотреть пиратские копии фильмов и музыкальных альбомов.***

Говоря о своих оппонентах, Акопов не пытается подбирать выражения. *«Это 30 миллионов уголовников, эти соучастники известны, но 30 миллионов посадить в тюрьму нельзя, а 10 тысяч – можно,– заявил глава «АМЕДИА».– Мы в состоянии подать иск от лица 22 крупнейших компаний к сети «В Контакте».* Акопов считает, что в иске должны быть указаны не только пользователи и руководители «ВКонтакте», но и провайдеры, содействующие, по его мнению, пиратству. Сумму нанесенного ущерба президент «АМЕДИА» определил в $100 млн. *«Но не надо нам этих денег, давайте отдадим их родной милиции на реконструкцию»,– предлагает Александр Акопов.*

Руководитель пресс-службы сети «В Контакте» Владислав Цыплухин не стал комментировать заявление Акопова, так как не получал иска «АМЕДИА» и не знаком с требованиями ее руководства. Сеть «В Контакте» и раньше обвинялась в потакании пиратству, но доказать преступный умысел пока никому не удалось.

## Интернет-зависимые китайцы устроили бунт в исправительном учреждении

***В Китае группа из 14 молодых людей в возрасте от 15 до 22 лет совершила побег из исправительного учреждения, где их с помощью физических и психологических упражнений лечили от болезненного пристрастия к интернету. На этот решительный шаг они пошли из-за того, что не могли больше терпеть «монотонную работу и интенсивные тренинги».***

Происшествие случилось в провинции Цзянсу. Сообщается, что беглецы застали дежурного надзирателя врасплох, когда тот находился в своей постели, и, извинившись, связали его. После этого они группами по трое отправились в родной город их предводителя.

Однако свободой молодые люди наслаждались недолго: водитель такси вызвал полицию, поскольку они не смогли заплатить за проезд. The Times отмечает, что беглецы «не нашли почти никакого сочувствия» и у своих «разгневанных родителей», которые заплатили за полугодовой курс лечения в лагере по 18 тыс. юаней (1830 фунтов).

*По материалам www.negani.com, www.newsru.com, www.inopressa.ru, www.rian.ru*

# ПРЫВІТАННЕ, СОНЕЙКА!!!

***Дачакаліся! Рэшта іспытаў і хвастоў здадзена. Пачынаюцца практыкі, а потым яно – час весялухі, цяплыні і прыгажосці. Як зрабіць іх найбольш плённымі – чытай нашыя добрыя парады.***



**Наконт здароўя.**

Сачыце за тым, каб не патрапляць у перапады тэмпературы. Калі вы ў памяшканні з кандыцыянерам, не зрабіце перапад большы за пяць градусаў ад вулічнай тэмпературы (напрыклад, 30 і 25 $C^0$). Перш, чым кідацца ў ваду, патрымайце ў ёй руку, калі праз пару хвілін перастане пашчыпваць ад холаду – лезьце.

Марозіва і напоі з лядоўні трэба ўжываць дробнымі глыткамі, або трымаць у роце пакуль яны не сагрэюцца. Сладкія газіроўкі і піва не ратуюць ад смагі. Як турыст кажу, зялёная і чорная гарбата спрадвеку ратавалі жыхароў пустэльняў і вам дапамогуць. Мяса, яйкі, малочныя, кандытарскія вырабы (і крэмавыя, і беляшы) хутка псуюцца ў спёку, так што набываем толькі ў крамах і з лядоўні. Сцьвярджэнні, што садавіна смачнейшая з галіны, а ў вас моцны страўнік – лепш забудзьце, бо ў незалежнасці ад вашай веры ў іх і ў свае звышнатуральныя здольнасьці, бацылаў ніхто не адмяняў. Не жадаеце некалькі дзён праваляцца з чырвоным горлам ці адсядзецца ў задуменнасці ў хмызах замест адпачынку – прыслухайцеся.

**Наконт вопраткі.**

Шорты, шлёпкі-в'етнамкі, спартовыя касцюмы і майкі –барцоўкі класныя на пляжы, а не ў горадзе. Шлёпкі, басаножкі носяцца без шкарпэтак, для таго яны і прыдуманыя. Красоўкі не ідуць да строгага касцюма, як і сур'ёзная кашуля да шортаў. Пантофлі-пляцёнкі і макасіны створаня для лёгкіх афіцыйных гарнітураў. Натуральныя матэрыялы і розум дазваляюць не парыцца і пры гэтым выглядаць стыльна. Ільняныя рэчы спрадвеку былі прыкметай нашых продкаў. Яны ідэальныя на спёку і іх можна, канечне ў разумных межах, не прасаваць. Яшчэ: мужчыны ўсяго света купаюцца ў боксерах і шортах. Тангі (дзьва трохкутнікі) і стрынгі (адзін трохкутнік і вяроўка) – прыкмета стрыптызёраў і лохаў.

**Дарэчы пра пляж.**

Возера Люхава знаходзіцца ў зоне забруджання ад нашых прамысловых прадпрыемстваў, на Дзвіне пакуль няма карантыну, але хіба хутка будзе. Горад абяцае адбудаваць новыя пляжы на Завеллі і Белым, але абяцанкі – цацанкі, дурню радасць. Пакуль няма там нічога, карыстайцеся з таго, што маеце.

Каб не спаліцца на сонцы, не атрымаць з часам меланому, прымаць сонечныя ваны трэба ў перыяд найменьшай ультрахвалёвай актыўнасці, то бок раніцай да 12 гадзін і пасля 15 гадзін днём. Ужывайце спецыяльныя абарончыя крэмы. Прыпомнім, срок дзеяння іх не больш за дзьве гадзіны. Яны ўпітваюцца і змываюцца, а напісаныя на тубках працэнты – гэта іх моцнасць, а не час дзеяння.

Вясёлага адпачынку і сустрэнемся загарэлымі!

***Ваўчара-Воўжык***

# ГАРАДЗКОЕ ЖЫЦЬЦЁ НА МІЖНАРОДНЫМ МОЛАДЗЕВЫМ ФОТАКОНКУРСЕ «SHOOT NATION 2010»

***Маладыя людзі ад 11 да 25 год запрашаюцца да ўдзелу ў конкурсе «Shoot Nation 2010». Тэма конкурсу ў гэтым годзе «Гарадзкое жыцьцё». Кожны канкурсант можа падаць тры фота ці малюнкі на тэмы: «Што азначае для цябе панятак «горад»?», «Сталеньне ў горадзе» і «Зь вёскі ў горад, з гораду ў вёску – людзі пераяжджаюць».***



**К**ожны канкурсант можа падаць адзін здымак ці малюнак у кожнай з трох катэгорыяў. Прызы прадугледжаны за:

• лепшы фотаздымак;
• лепшы малюнак;
• лепшы фотаздымак у кожнай з трох тэматычных катэгорыяў для канкурсантаў ва ўзросьце ад 11 да 16 і ад 17 да 25 год;
• лепшы малюнак у кожнай з трох тэматычных катэгорыяў для канкурсантаў ва ўзросьце ад 11 да 16 і ад 17 да 25 год;

Пераможцы атрымаюць лічбавыя фотаздымачы, гадавую падпіску на часопіс «National Geographic», ды іншыя прызы. Вынікі конкурсу будуць абвешчаныя **12 жніўня**. Выбраныя конкурсныя фотаздымкі будуць прадстаўленыя ў межах сьвяткаваньня Дню моладзі ў штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных нацый у Нью-Ёрку.

Творчыя працы належыць дасылаць праз адмысловую он-лайн форму.

Калі вы ня маеце доступу да фотаздымача, вы можаце даслаць свае малюнкі разам з запоўненай формай заяўкі на адрас: Plan UK, 5–7 Cranwood Street, London, EC1V 9LH. Апошні тэрмін падачы працаў – **28 ліпеня 2010** г.

Падрабязная інфармацыя і спасылкі на онлайн-форму заяўкі разьмешчаныя на сайце конкурсу http://beta.shootnations.com.

***Паводле elekcyi.org generation.by***

# МАРАДОНА И ВСЕ-ВСЕ-ВСЕ

***У меня это уже седьмой чемпионат. Первый был в Мексике, в 86-м. Нужно ли говорить, что я его помню лучше всего?***

**В**се последующие слились в один клубок с всплывающими картинками: ламбада Роже Миллы у углового флажка, слёзы Роберто Баджо, проплешина Зидана, клюющая то вражеские ворота, то вражеские животы, придурочная причёска Роналдо и его феноменальная игра. Последний чемпионат помню хуже всего. В Мексике – почти каждый матч. То был **его** чемпионат. Марадоны. И это не моя мысль. Это всем известно. И не только из-за «руки Божьей». Он сам играл как Бог. Вырезанная фотография из газеты «Футбол-Хоккей», где Марадона целует Кубок Мира, казалась одной из самых ценных вещей в мире. Я тоже чувствовал себя сопричастным. Я болел за Аргентину. Я видел Это.

В то лето в деревне у бабушки на поле, где ежедневно гоняли в футбол, мы с братьями в честь триумфа любимой команды установили флаг Аргентины. Сами раскрасили кусок ткани. Я прочитал, что в Буэнос-Айресе в то время стало модным вместо солнышка на государственном стяге изображать лицо Диего Марадоны. Наши художественные способности были невысоки, поэтому пришлось рисовать привычное солнышко с лучиками. Мы сделали длинное древко, чтобы флаг был виден издалека. Так мы, сами не подозревая, пометили свою территорию свободы, где не было ни школы, ни учителей, ни взрослых. Сквозь смех, можно сказать, что это был такой хоть и детский, но вполне «диссидентский» шаг: показали «фак» унылому пионерскому занудству со скучным знаменем и галстуками. Аргентинский флаг казался инопланетным: на нём светило Солнце.

Про «диссидентство» это я не зря. Через несколько дней к дому бабушки прикатил «уазик» председателя колхоза. Взбудораженный председатель потребовал немедленно «снять эту политическую провокацию».

**Он вернулся**

Марадона вернулся на мундиаль. Собственно говоря, после триумфа 86-го он ещё дважды выкатывался колобком на поле. И с каждым разом это было по-киношному драматично. (Кустурица, конечно, молодец. Увидел, что такая фактура, ну просто просится на экран. Но почему никто не додумается снять про Марадону кино художественное!?). Сперва была отяжелевшая игра и рыдания в финале, на этот раз от обиды. Затем совершенно запредельный голевой перформанс человека с устойчивой репутацией наркомана, и выдворением из турнира из-за допинга. В моче Марадоны были обнаружены пять различных амфетаминов.




Теперь он вновь на чемпионате. Уже в ранге тренера. В цивильном костюме. С бородой, делающей его похожим на гнома. Заявляет, что «завязал» с кокаином и прочим 6 лет назад. В Марадону как тренера, кроме Аргентины, никто не верит. Да и на родине критикуют нещадно. Но жизнь этого человека настолько неординарна, что с трудом верится, что Диего и его сборная просто тихо сойдут с дистанции. Даже если и проиграют, должен же Марадона чего-нибудь отчебучить. А может всё-таки пробежит голышом по Буэнос-Айресу?

**Антифутбол**

Нынешний чемпионат уже критикуют за «серость» матчей. Прагматичный «сухой» футбол (или как его модно называть антифутбол) вызывает гнев болельщиков, жаждущих крови – атак и голов. Но разве мы не привыкли к этому? Разве не на наших глазах происходит (или уже произошла) эволюция от романтичного футбола к канцелярскому стилю, где важен результат? Как раз таки в Мексике 86 и был этот последний романтический чемпионат, с кучей голов, в том числе и финале. Уже через четыре года в Италии болельщики заныли, что мало голов, а много тактики. Чемпионами тогда стали пресные немцы, (а потом ещё были совершенно занудные и примитивные греки в ранге чемпионов Европы). А железобетонная победа итальянцев на прошлом мундиале? Разве мы не привыкли к этому? Поэтому остаётся радоваться тактическому напряжению в каждом матче, практически отсутствию явных фаворитов и тому факту, что оборонительно-выжидательный стиль может дать шанс даже самым отсталым. Даже бразильцы в этом году не выбиваются из общей канвы – главные их звёзды сплошь защитники да вратарь. Когда такое было?

Мне лично доставляет особое удовольствие видеть как пока сыпятся вип-команды. Французы, итальянцы, англичане, испанцы, немцы. Схема «порядок бьёт класс» — в действии. На этом фоне бразильцы и аргентинцы выглядят весьма выигрышно. Вроде как полностью спокойны, что примета сработает и на этот раз – на всех чемпионатах за пределами Европы команды Старого Света мимо чемпионства пролетали. Ну, а на фоне более откровенного футбола во втором туре группового турнира, главные темы первой недели мундиаля – вувузелы и джабулани – к счастью сменились непосредственно футболом. К вувузелам все привыкли. Оказалось, что вред они причиняет скорее не ушам, а самим любителям подудеть – первой пострадавшей от африканской «бабуиноотгонялки» стала фанатка сборной Англии. Так она настойчива «вувузела», что надорвала связки. А от мяча «Джабулани» болельщикам радость одна – смотреть как «портачат», пытаясь словить снаряд, некоторые вратари, особое удовольствие. В отличие от ворчащих голкиперов.

**В Африке большие крокодилы**

Была мысль, что раз уж чемпионат в Африке, то от самих африканских команд придётся ждать если не триумфа, то уж яркого выступления точно. Теория практикой не подтверждается. Во-первых, хозяев ЮАР судьи за уши тянуть, вроде как, не собираются. Во-вторых, из года в год африканские команды так и не могут выйти из ранга подающих надежды. Большая часть команд Чёрного Континента, похоже, после группового турнира отправятся домой. Там всё та же проблема: при отличном (от года к году всё лучше и лучше) подборе отдельных великолепных игроков, команд как не было, так и нет. Всё то же отсутствие дисциплины. А у некоторых, как у Кот Д'Ивуара во время игры с бразильцами, когда первые опустились до отвратительных провокаций, отсутствие игровой порядочности.

**PS**. Мысль о том, что современный футбол измельчал на харизматичские личности, блистающие на поле и вне его, подтверждается. Криштиану Роналдо слишком гламурен, Кака слишком богобоязненен, Месси (при всём своем игровом великолепии) слишком скучен. Остается нынешним героям «списывать» у старших. Аж два раза подыгравший себе рукой, забивая эвуарийцам бразилец Луис Фабиану, завил, что это была... «рука Бога». Жаль, что рядом в этот момент не оказалось самого Бога, что бы своей пухлой ручкой отвесить наглецу подзатыльник.

***Александр Отвалко***

# ПОЛАЦКІ «РУБОН» – ПОКЛІЧ З МІНУЎШЧЫНЫ

***Доўгачаканы трэці фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон», што адбыўся ў Полацку на мінулых выходных 12–13 чэрвеня, заняў свае пачэснае месца ў шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 1148-годдзя Полацка. На працягу двух дзен жыхары і госці горада апынуліся ў сапраўдным сярэднявеччы – рыцары, прыгожыя дзяўчаты і хлопцы ў сярэднявечных строях нібыта перанесліся ў XXI стагоддзе з сівой мінуўшчыны.***

**На старой пляцоўцы з новымі і старымі сябрамі**

Каля трох сотень удзельнікаў з больш чым дваццаці клубаў гістарычнай рэканструкцыі дапамаглі адчуць гасьцям свята сапраўдную атмасферу сярэднявечнага Полацка. Дапамагала гэтаму і тое, што селета фэст таксама праходзіў ля сцен старажытнай Полацкай Сафіі. На пляцоўцы перад ёй вырас невялікі драўляны замак. Арганізатары вырашылі не разносіць пляцоўкі далека, каб гледачы і турысты маглі хутка перасоўвацца паміж імі ў пошуках найбольш цікавага відовішча. А ўжо ў пятніцу свае шатры і наметы раскінуў рыцарскі стан, дзе зажылі сваім неверагодным сярэднявечным жыццём вікінгі і манголы, лучнікі і латнікі, простыя драбы і выкталцоныя рыцары, прыгожыя дамы ў раманскіх і гатычных сукнях і простыя гараджанкі гатавалі ежу сваім мужным ваярам. На працягу двух фестывальных дзен лязгала зброя, грала сярэднявечная музыка, і спрабавалі свае сілы ў турнірах і бугуртах лучнікі і ваяры.

**«Лучнікі – гэта нешта магічнае»**

Гэткія словы я пачуў у натоўпе гледачоў ад маладзенькай прыгажуні, якая захоплена назірала за спаборніцтвам лучнікаў. А паглядзець сапраўды было на што. Больш за 2 дзесяткі чалавек селета ўзяла ўдзел у турніры лучнікаў, які праходзіў па складанай сістэме. Спачатку ўдзельнікі стралялі з 25 метраў, набіраючы балы, потым спаборніцтва ўскладнілася стральбой па маятніку, «яблыку» і стрэламі з большых дыстанцый. Ну, а шасцера фіналістаў аспрэчвалі права стаць першым на адлегласці 45 метраў, з якой больш дакладна паклаў свае стрэлы ў цэнтар мішэні Пан Хорст з Мінскага стралковага клуба лучнікаў. Кожны жадаючы мог пастраляць з лука, каб адчуць магію гэтай дзеі – бярэш стралу, накладваеш на цеціву, плаўна, але моцна нацягваеш лук, на палову секунды затрымліваеш подых, каб пацэліць у мішэнь і адпускаеш пальцы, і вось твая страла дрыжыць, уваткнуўшыся зусім не там, куды цэліў. Патрапіць з першага раза амаль немагчыма, а трапнасць дасягаецца не адным дзесяткам трэніровак.



**Лепшыя з лепшых**

Адной з самых відовішчных частак фестываля сталі рыцарскія турніры. Для тых ваяроў, якія займаліся рэканструкцыяй ранняга сярэднявечча, эпохай славян і вікінгаў адбылося так званае «Ратнае кола». Праходзіла яно па алімпійскай сістэме: выйграў двабой – перайшоў у наступнае кола, прайграў – ідзі да гледачоў і назірай як твае калегі бадзера мнуць бакі адно аднаму. Селета пераможцам у «Ратным Коле» стаў госць з Польшчы Марамір, які наведаў «Рубон» у складзе менскага клуба «Труварынг».

У наступным турніры высветліць лепшага з лепшых мусілі цяжкія латнікі цалкам закаваныя ў сталевыя латы. І пачаўся турнір, у якім прынялі ўдзел больш за 20 цяжкаўзброеных рыцараў з розных клубаў Беларусі. Удзельнікі падзяліліся на групы і высвятлялі найбольш моцных і ўдалых ваяроў. У выніку лепшым з лепшых стаў мінскі рыцар Пан Ціхамір.

**Патаньчым і заспяваем**

Сапраўды цікавым фестываль рабілі ня толькі мужныя рыцары. Добрую палову дня турыстаў і палачан, што завіталі на сьвята весяліў, вучыў гуляць у беларускія традыцыйныя гульні і таньчыць народныя танцы гісторыка-культурны клуб «Княжыч» з Наваполацку. А вечарам у суботу хлопцы і дзяўчаты з «Княжыча » зладзілі такія «зажыгальныя» танцы ў рыцарскім лагеры, што мужныя ваяры і іх дзяўчаты проста мокрымі выходзілі пасля 10 хвілін «Ойры».

**Усе на бугурт!**

Бліжэй да вечара рыцары зладзілі сваю ўлюбёную забаву – бугурты. Прасцей кажучы, бойка «сценка на сценку». Ва ўсе часы рыцары, каб не згубіць баявых навыкаў, практыкаваліся ў ваярскім майстэрстве – трэніраваліся ў фехтаванні, барацьбе, і ладзілі невялікія імітацыі вялікіх баеў, падзяліўшыся на дзве ці болей партыі. Менавіта так і з’явіліся бугурты – самая любімая рыцарская забава,

якая адрозніваецца ад сапраўднай вайны толькі затупленай зброяй і больш асцярожным стаўленнем да суперніка. Селета ў бугурце прыняло ўдзел больш за пяць дзесяткаў вояроў, якія праверылі свае майстэрства ў некалькіх імправізаваных боях.

Спачатку латнікі сышліся камандамі 5Х5, высвятляючы, які клуб найбольш валодае не толькі індывідуальным майстэрствам фехтавання, але і тактычным узаемадзеяннем у камандзе. У выніку на першым і другім месцы апынуліся хлопцы са зборнай каманды Беларусі па гістарычным фехтаванні.

Трохі пазней на пляцоўцы перад Сафійскім Саборам адбыліся масавыя бугурты, дзе зборная каманда Беларусі па гістарычным фехтаванні зноў даказала свае майстэрства, двойчы атрымаўшы перамогу над супернікамі.



**«Выпрабаванне агнем»**

Але самы цікавы сюрпрыз арганізатары прытрымалі на вечар, калі ўдзельнікі полацкага клуба «Полацкі звяз» прэзентавалі гледачам сваю новую пластычную тэатралізаваную пастанову «Выпрабаванне агнем». Падзеі спектакля распавядалі аб часах станаўлення дзяржаўнасці часоў князя Міндоўга, які аб'яднаў малыя княствы і стварыў першую беларускую дзяржаву. Затаіўшы подых гледачы назіралі за падзеямі тых часоў у інтэрпрэтацыі таленавітых хлопцаў і дзяўчат з «Полацкага звяза», а элементы фаер-шоў, якія былі ўвасоблены ў пастаноўцы проста зачаравалі ўсіх вогненнай прыгажосцю.

**Непрыступны полацкі замак**

Наступным ранкам адбылася кульмінацыйная падзея – тэатралізаваны штурм полацкага замку, які паўстаў на пляцоўцы побач са старажытнай полацкай Сафіяй. У бойцы сыйшліся лепшыя з лепшых, падарыўшы гледачам незабывальнае сярэднявечнае шоў з бойкамі, стрэламі лучнікаў, штурмам замку.

Пасля, стомленыя, але задаволеныя ўдзельнікі штурму, пастроіліся перад гледачамі, якія сустрэлі і абаронцаў замка, і штурмуючых аглушальнымі апладысментамі.

**Хто не танчыць – той Лось**

Яшчэ адным падарункам для гараджан, гасцей і ўдзельнікаў «Рубона» стаў канцэрт вядомага гурта сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса». *«Мы ў шосты раз завіталі ў Полацк і трэці раз граем на фэсце «Рубон». Селетні фестываль больш маштабны, гэта адразу кідаецца ў вочы, – заўважае лідар гурта Зьміцер Сасноўскі. – Нам вельмі прыемна, што сцэна селета зноў стаіць пад сценамі Сафіі, гэта вельмі сімвалічна».*

**Рубон , бывай да наступнага года!**

Усе добрае рана ці позна сканчваецца, скончыўся і трэці фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон». У гэтым годзе ў фестывальнай скарбонцы больш за 300 удзельнікаў з усіх бакоў Беларусі і блізкага замежжа. На два дні Полацак апынуўся ў сапраўдным сярэднявеччы, парадаваўшы і сваіх жыхароў, і ўдзельнікаў, і гасцей горада. Турніры, бугурты, канцэрты, штурм замку – усе гэта стала больш прыгожым, відовішчным, рэалістычным і маштабным. Селета, у год 600-годдзя Грунвальда, «Рубон» стаў адным з самых буйных і прыгожых фэстаў сярэднявечнай культуры ў Беларусі.

Ад'язджаючы, удзельнікі рыцарскіх клубаў казалі – як добра было б вярнуцца ў Полацак праз год, у наступным маі, калі над месцам, дзе Палата зліваецца з Дзвіной зноў паляціць старажытны покліч полацкага ваярства – Рубон!

*Сяржук Стахоўскі*
*Фота С. Балай і В. Вяршыцкая*

# НЕ СПИ ДОЛГО, А СПИ УМНО

***«Беспокоитесь, что не удается поспать пресловутые восемь часов? В этом ваша первая ошибка», – пишет The Independent, ссылаясь на доктора Нерину Рамлахан.***

Главное – качество сна, а не его продолжительность. «Самые большие заблуждения – что требуется семь-восемь часов сна в сутки и что нельзя просыпаться ночью. Вставать рано утром – совершенно нормально. Студент в состоянии хорошо показать себя на экзамене даже если прошлой ночью он не спал», – утверждает Рамлахан.

Она призывает не преувеличивать важность воздержания от еды перед сном. По ее словам, гораздо важнее вовремя позавтракать. Делать это нужно во время так называемого «метаболического окна». Также рекомендуется обращать внимание на свои сновидения, отыскивая в них указания на еще не разрешенные жизненные проблемы.

Не существует единого для всех стандарта продолжительности здорового сна. Важно «приспособиться к своим потребностям в разные периоды… В какие-то периоды вам может быть нужно четыре часа. В других случаях эта цифра может увеличиваться до семи или восьми», – указывает Рамлахан. Полезно делать краткие перерывы на сон в течение рабочего дня, а также заниматься физкультурой.

Для здорового сна важна обстановка. Кому-то лучше спится под белый шум, некоторые используют затычки для ушей и повязки на глаза. «Все это для того, чтобы уменьшить количество раздражителей и послать мозгу сигнал о том, что вы находитесь в безопасности», – поясняет доктор.

*www.inopressa.ru*



**Нічога**
Паміж намі нічога няма.
Ні каханьня, ні здрады – нічога.
І завея – як цень ад крыла
херувіма – пасланьніка Бога.
Ён у нашыя сны заляцеў
і прымусіў паверыць дазваньня,
што як хваля на ціхай вадзе,
узьнікае з нічога Каханьне.

**Шэптам**
Прыкшчуся нанач
да шэптам вымаўленага
слова Радзіма,
што ў Бога вымалена...
Што ў злачасіну
было затулена –
крылом Страціма,
душой матулінай.

**Натхненьне**
Як цеціва, страла і лук,
як з ноты вызвалены гук,
як палімпсеста тайнадрук,
як варажба цыганскіх рук,
як аральля і гостры плуг,
як жырандоля і жаўрук –
Натхненьне.

**Класіка**
*– Мой родны ліфт,*
*як ты мне мілы...* –
шапчу, вярнуўшыся з дарог.
Паэтам дадзеныя крылы,
іх выбірае з лепшых Бог.

У неба месячных падстрэшках,
як вераб'і, анёлы сьпяць...
Пакуль паэты пішуць вершы –
паэтам дадзена лятаць!

**Жарсьць**
Мой грэх сьмяротны – гэта ты.
Я так кахаў цябе аддана –
да першароднай яснаты
на дне сьвітальнага тумана.

Мой грэх сьмяротны – гэта ты.
Я так хацеў цябе бязбожна, –
як хоча грэшніцу сьвяты
схіліць на праведнае ложа...

## Эдуард Акуллін

Папулярны паэт, перакладчык, бард, аўтар шматлікіх публікацый, удзельнік многіх песенных і паэтычных фестываляў. Нарадзіўся ў 1963 г. ў вёсцы Вялікія Нямкі, што на Веткаўшчыне. Захапленне паэзіяй прыйшло ў школьныя гады. У шостым класе ён напісаў свой першы верш. Скончыў гісторыка-філалагічнае аддзяленне Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, аспірантуру Інстытута Літаратуры НАН Беларусі.

У1990 г. пераязджае на сталае месца жыхарства ў Мінск, дзе на працягу адзінаццаці гадоў (1990–2001 г.г.) працаваў загадчыкам філіяла Літаратурнага музея М. Багдановіча «Беларуская хатка». З 2001 года Э. Акулін пераходзіць на працу загадчыка аддзела паэзіі часопіса «Полымя». За апошнія гады паэт выдаў некалькі кнігаў вершаў, а таксама дзіцячыя кніжкі.

# ВРЕМЯ РАССЛАБЛЯТЬСЯ!

***Ну что, дорогие читатели, вот и дожили мы с вами до конца учебного года. Сессия заканчивается, у кого-то хорошо, у кого-то не очень, но все равно чувствуется приближение долгожданного отдыха. Лето как никак.***

Пока что никак, скажете вы, то дождь все зальет, то экзамен сдавать. Но ничего, потерпеть осталось совсем чуть-чуть. И, конечно, хочется отдохнуть так, чтобы и погода не мешала, и впечатления надолго остались. А тут, как нельзя кстати, в Витебске открывается «Славянский базар». Ну что интересного может быть на этом пугачевско-киркоровско-басковом празднике, спросите вы и будете крайне удивлены некоторым выступлениям, которые состоятся в рамках фестиваля. А теперь подробности. Даже можно сказать: MAKASIN рекомендует.

**10 ИЮЛЯ 18.00 «СОВРЕМЕННЫЙ ДЖАЗ БЕЛАРУСИ, РОССИИ И УКРАИНЫ»**

Витебская областная филармония.

Цена: партер – 25 000 руб.,
ярус – 15 000 руб

AKANA-NHS (Беларусь), квартет Алексея КУЗНЕЦОВА (Россия), Сергей ДАВЫДОВ и «LUSH LIFE» (Украина).

Концерт интересен поклонникам, как джаза, так и рока, потому что вокалистка группы *AKANA-NHS* Руся, известна поклонникам белорусской инди-сцены по работе в проекте Indiga, рок-княжна 2006 года. Ну, а видеть и слышать, как рок певцы уходят в джаз всегда интересно.

http://www.akana-nhs.com/

**11 ИЮЛЯ 19:00, ЭТНО-ТРИО «ТРОИЦА» (БЕЛАРУСЬ)**

Театр имени Якуба Коласа
1–11 ряд – 35 000 руб.,
12-18 ряд – 30 000 руб.,
ярус – 25 000 руб

Ну, про эту группу говорить поклонникам фолка ничего не надо, а вот тем, кто хочет, может быть в первый раз, услышать истинно белорусские мотивы в медитативной форме настоятельно рекомендуем посетить сие действо.

http://troitsa.net/

***Подготовил Ozz***

**Наклад: 299 ас.**
**бясплатна**

Заснавана ў 2004 годзе. Выдаецца на правах рукапісу.
Думкі аўтараў могуць не супадаць з нашым уласным меркаваньнем.
Матэрыялы падаюцца на мове аўтараў.
**Харошыя людзі:** М.Азарова, Н.Сарокіна, В.Лобаў, В.Сублім.
**www.makasin.info** | **e-mail:** hazeta@gmail.com |
Надрукавана на асабістым абсталяваньні